ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 23 (857) ● ● ЧАЦВЕР, 7 верасня 1972 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXV

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

● На пасяджэнні партыйнага камітэта ● Ураджаннямі дзеляцца першакурснікі ● Да свята балгарскага народа ● Байцы ўспамінаюць працоўны семестр.

## МІТЫНГ САЛІДАРНАСЦІ

У гэтыя дні, калі в'етнамскі народ, працоўныя нашай краіны і ўсё прагрэсіўнае чалавецтва адзначаюць 27 гадавіну ўтварэння Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам, па ўсёй рэспубліцы праходзяць мітынгі салідарнасці з в'етнамскім народам. Працоўныя Беларусі вітаюць поспехі В'етнама на шляху велізарных сацыяльных пераўтварэнняў, яго дасягненні ў сацыялістычным будаўніцтве.

Сёння ў 14 гадзін у актавай зале збяруцца студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта, каб заявіць аб сваёй салідарнасці з народам гераічнага В'етнама, павіншаваць в'етнамскіх сяброў з вялікім святам.

## У ПАРТКОМЕ

Учора адбылося першае ў гэтым навучальным годзе пасяджэнне партыйнага камітэта. Абмеркаваны план работы на 1972-73 навучальны год, мерапрыемствы па падрыхтоўцы і правядзенню справаздачна-выбарных сходаў у камсамольскіх і прафсаюзных арганізацыях. Члены парткома інфармаваны аб стане ўплаты членскіх узносаў.

Планам работы прадугледжана правесці сход партыйнага, прафсаюзнага, камсамольскага і гаспадарчага актыву з павесткай дня «Аб стане і мерах па далейшаму выкананню мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да 50-годдзя ўтварэння СССР», агульнауніверсітэцкі сход, прысвечаны задачам камуністаў у сувязі з пастановай ЦК КПСС ад 28 ліпеня 1972 года «Аб мерах па далейшаму ўдасканаленню вышэйшай адукацыі ў краіне». Адзін са сходаў сканцэнтруе ўвагу камуністаў на стане і мерах па далейшаму паляпшэнню ідэалагічнай работы ва універсітэце.

На пасяджэннях партыйнага камітэта на працягу года будуць абмеркаваны вынікі працоўнага семестра, стан лекцыйнай прапаганды ў падшэфных раёнах, ваенна-патрыятычнае выхаванне студэнтаў, праца асобных кафедр і факультэтаў і шмат іншых важных пытанняў паўсядзённага універсітэцкага жыцця.



*Каля дзвюх тысяч юнакоў і дзяўчат з ліку першакурснікаў папоўнілі сёлета камсамольскую арганізацыю нашага універсітэта.*

*НА ЗДЫМКУ: загадчык сектара ўліку Т. ЖУРАВА ставіць на камсамольскі ўлік студэнта I курса В. КУРЧАВА.*

*Фота Д. ЧАХОВІЧА.*

## ПА УНІВЕРСІТЭТУ

Раніцай, у панядзелак, больш трох тысяч студэнтаў II—IV курсаў адправіліся на сельскагаспадарчыя работы. У Бярэзінскім, Валожынскім, Смалявіцкім раёнах пасланцы БДУ дапамогуць калгаснікам і працаўнікам саўгасаў своечасова сабраць ураджай бульбы.

**ТАБЕ, ПЕРШАКУРСНІК**

Так называецца выстаўка метадычнай літаратуры, арганізаваная ў студэнцкай чытальнай зале бібліятэкі ў галоўным корпусе. Азнаёміўшыся з ёй, можна даведацца, як працаваць над кнігай і канспектам, карыстацца бібліятэчнымі каталогамі. Дапамогуць у гэтым кнігі Я. Я. Галанта «Праца над кнігай», Э. Цюрупы «Ці ўмееш ты чытаць?», Г. Дзяборына «Састаўленне канспекта», Б. Гарбачэўскага «Людзі, кнігі, бібліятэкі» і многія іншыя.

# БУДЗЕМ ВЕРНЫМІ АБЯЦАННЮ

Манатонна пастукваюць колы, кіламетр за кіламетрам прыбліжаючы мяне да Мінска. Цішыня ў вагоне. А ў цемені акна ўсё бачацца сумныя вочы мамы...

«Я ж ужо зусім дарослая»,—думала ці то адказваючы на гэты позірк, ці то адганяючы трывожныя пытанні: «Як ён сустрэне, універсітэт? Якім будзе мой шлях у журналістыку?»

Прыехала — і адразу ж ва універсітэт. Зайшла ў дэканат.

— Ну што ж! Калі ўжо прыехала — бярыся за справу, — з усмешкай сустрэў Міхаіл Іванавіч Сілуянаў. — Будзеш студэнцкія білеты сваім будучым аднакурснікам выпісваць. Толькі пастарайся прыгожа і акуратна.

І я з радасцю ўзялася за гэта першае даручэнне. Хацелася выканаць як найлепш. Ужо пад вечар паехала ўладкоўвацца ў інтэрнат.

Мабыць яшчэ і ранавата рабіць вывады, але я лічу, што мне пашанцавала трапіць у пакойчык дзвюх Тамар — Абрамовіч і Федарцовай з чацвёртага курса. Спачатку сумнявалася: «А ці можа быць у нас штонебудзь агульнае? Я ж перад імі горкае дзіця».

Дарэмныя хваляванні! Знайшлі і агульныя інтарэсы, і агульную мову, як кажуць. Дзяўчаты многа расказалі пра універсітэт, пра факультэт журналістыкі і яго добрыя традыцыі.

З асаблівым хваляваннем ішла 31 жніўня на сход студэнтаў-першакурснікаў. Напэўна не адна я, слухаючы выступленні дэкана факультэта, выкладчыкаў, думала: «Ды хіба ж мы не разумеем?! Паступілі — значыць усе сілы аддадзім, каб апраўдаць спадзяванні бацькоў, настаўнікаў, рэдкалегій газет, дзе друкаваліся».

Хацелася б, каб мае аднакурснікі ўсе пяць год вучобы ва універсітэце засталіся вернымі гэтаму абяцанню. Ды, урэшце, гэта наш абавязак, і не выканаць яго няма ніякіх падстаў. Было б толькі жаданне! Гэты вывад я зрабіла пасля першых дзён заняткаў. Вельмі цікава! Асабліва спадабаліся лекцыі Н. І. Лапідуса па зарубежнай літаратуры і А. В. Балаша па тэхніцы афармлення газеты, хоць ён і папярэдзіў, што гэта самы нецікавы прадмет.

Думаю, не памылюся, калі і ад імя аднакурснікаў скажу: «Шчырае дзякуй, універсітэт, за цёплы прыём, за ўсе клопаты! Пастараемся з гонарам абараніць права быць тваімі студэнтамі».

**М. ШЫМКО,**
**студэнтка I курса факультэта журналістыкі.**

## ЛЯ ПАДНОЖЖА ВЯЛІКАЙ НАВУКІ

Многія з іх прыходзяць на заняткі яшчэ ў школьнай форме, выкладчыкаў называюць настаўнікамі, а лекцыі— урокамі. Яны — першакурснікі, тыя, хто ўпершыню пераступіў парог нашага універсітэта. Менавіта для іх рэктарат, партком і камітэт камсамола арганізавалі дні ведаў. Нядаўна збіраліся разам студэнты першых курсаў прыродазнаўчых факультэтаў. Сёння актавую залу запоўнілі гуманітарыі. Хвалююцца ўсе: яны ж атрымліваюць наказ перад вялікай дарогай, якая вядзе да вяршынь ведаў.

У прэзідыуме прафесары, вядомыя вучоныя, кіраўнікі грамадскіх арганізацый. Урачысты сход адкрывае прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар С. А. Умрэйка. Ён віншуе прысутных з уступленнем у вялікае жыццё. Тры галоўныя задачы стаяць перад сённяшнімі першакурснікамі: добра вучыцца, берагчы гонар вну, актыўна ўключыцца ў грамадска-палітычную работу.

Прафесара Алега Антонавіча Лойку добра ведаюць аматары беларускай паэзіі. Ён гаворыць аб значэнні ў наш час гарманічна развітай асобы, аб тым, што гармонія — гэта прыгажосць, чалавечнасць, розум, любоў да Радзімы. Трэба імкнуцца ведаць як мага больш, каб стаць карысным для грамадства.

Выступаюць доктар філасофскіх навук, член-карэспандэнт Акадэміі навук БССР І. М. Лушчыцкі, загадчык кафедры сучаснай рускай мовы, прафесар М. Г. Булахаў, сакратар камітэта камсамола БДУ Алег Слука. Яны гавораць аб тым, што навука прымае толькі настойлівых і працавітых. Трэба шмат працаваць, імкнуцца авалодаць марксісцкай навукай, стаць шырока эрудзіраваным чалавекам. Сучасны спецыяліст — грамадскі дзеяч. Значыць, трэба навучыцца працаваць з людзьмі і для людзей, актыўна ўключыцца ў жыццё камсамольскай арганізацыі.

Свята закончылася паказам кароткаметражнага фільма «Беларускі універсітэт».

Л. ДРУЗЕВА.



**На здымку:** супрацоўнікі кафедры сістэматыкі раслін біяфака **А. М. Лісічкіна** і **Л. С. Губарава** разбіраюць гербарый летняй практыкі студэнтаў і рыхтуюць матэрыялы да вялікага практыкуму.

Фота **Д. Чаховіча.**

# І ПРЫЙДУЦЬ ПАШТОЎКІ

Дзесяткі кірак злосна ўразаюцца ў камяністую зямлю. Пырскаюць іскры. Гулкі пошчак адбойных малаткоў далёка разносіцца па ціхаму ранішняму лесу. У загарэлых руках школьнікаў і байцоў інтэратрада мільгаюць лапаты. Каля траншэй узвышаюцца пагоркі пяску і раскрышанага камення. Разгарэлася спаборніцтва — хто хутчэй выканае норму. Не выпускае з рук адбойнага малатка Клаус Бейер, мокрыя ад поту Хайнц Генслер, Лотар Стахан, Вольфганг Сейферт. Два Валеры — Протчанка і Прыемка — наўмысна спазніліся на снеданне, каб закончыць траншэю першымі. Але Сяргей Шыраеў паднёс ім сюрпрыз: ён аказаўся самым здольным землякопам. Яшчэ адну нечаканасць прынесла надвор'е: паліў нудны халодны дождж. Першымі не вытрымалі вымушанай бяздзейнасці Уладзімір Панарадаў, Вячаслаў Іваноў, Аляксандр Гурко. За імі пад дождж да траншэй выйшлі і астатнія. Вязкая гліна прыліпала да лапат, ад мокрых спін ішла пара, але работа не спынялася.

— Мне цяжка сказаць, хто быў лепшы на суботніку, — гаварыла пасля камандзір атрада Інга Шарп. — Кожны паказаў, на што ён здольны. А разам мы зарабілі 550 марак. Гэтыя грошы пайшлі ў фонд X Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Берліне і ў фонд В'етнама.

Гэта толькі адзін з эпізодаў працы інтэратрада «Беларусь-72» у невялікім гарадку Грайцы, што ўтульна размясціўся сярод маляўнічых узгоркаў у «зялёным сэрцы Германіі» — Усходняй Цюрынгіі.

Беларускія студэнты — фізікі, матэматыкі, гісторыкі, юрысты, журналісты — хутка знайшлі агульную мову са сваімі новымі нямецкімі сябрамі — студэнтамі тэхналагічнай секцыі Іенскага універсітэта імя Ф. Шылера. І перш за ўсё, зблізіла праца, якая не патрабавала перакладчыкаў, бо мова працы — мова інтэрнацыянальная. Працавалі мы ў асноўным на вуліцах горада: капалі траншэю для тэлефоннага кабеля. Праўда, «капалі» — гэта не тое слова, дакладней будзе, «секлі», бо грунт быў амаль з аднаго камення. Адбойныя малаткі ламаліся адзін за другім. І таму так дарэчы прыйшліся рацыяналізатарскія прапановы Тостэна Фройнда і камісара Анатоля Тозіка.

Раз-пораз да траншэй падыходзілі жыхары горада і пыталі, хто і што тут робіць. Даведаўшыся, што мы з СССР, яшчэ з большай цікавасцю сачылі за нашай працай. Тут, бадай, мы ўпершыню адчувалі ўсю адказнасць за сваю работу, а рукі, здаецца, самі ўзмахвалі кіркай.

...Поўдневая спёка. Пот залівае вочы. «Мамент, камрад», — пажылая жанчына працягвае нам бутэльку ліманаду.

...З глыбіні двух з паловай метраў трэба падняць бетонныя пліты. Дапамога прыйшла нечакана. Трактарыст, які выпадкова праязджаў, накіраваў сваю машыну да нас.

Вечарамі разгараліся спрэчкі, спявалі рускія, беларускія, нямецкія песні. А колькі сустрэч адбывалася гэтымі вечарамі! З польскімі, венгерскімі, чэшскімі, балгарскімі студэнтамі, якія працавалі ў Грайцы, з моладдзю хімічнага, тэкстыльнага, металургічнага заводаў. Сумесныя спаборніцтвы па футболу і валейболу, плаванню, экскурсіі...

Карцінная галерэя ў Дрэздэне і замак «Варнбург» у Айзенаху, Трэптаў-парк у Берліне і Музей капітуляцыі ў Патсдаме — не пералічыць усіх мясцін, дзе пабывалі нашы студэнты.

У апошні дзень працы камандзір атрада Валера Протчанка перадаваў з рук у рукі Ганаровы медаль — узнагароду ад Цэнтральнага Савета ССНМ, першую у гісторыі будаўнічых атрадаў.

Пройдзе зусім мала часу, і прыйдуць з ГДР паштоўкі на адрас Васіля Кузьміча і Валянціна Бутрына, Таццяны Цемнянковай і Аляксандра Міхальчанкі...

Ул. НАРКЕВІЧ,
баец інтэратрада
«Беларусь-72».

# НА МЕРЫДЫЯНАХ ТРЭЦЯГА ПРАЦОЎНАГА

## У АДЗІНЫМ ПАРЫВЕ

НАРЫС

*Закончыўся другі год шэфства камсамоліі рэспублікі над легендарнай Рудабелкай — Акцябрскім раёнам Гомельскай вобласці. Сёлета на тэрыторыі раёна працавала 27 студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Адным з лепшых і ў працы, і ў арганізацыі адпачынку стаў атрад «Буравеснік-72» філалагічнага факультэта БДУ на чале з камандзірам, студэнткай II курса Людай Агароднік. Прапануем увазе чытачоў некалькі старонак жыцця гэтага атрада.*

1. КАМАНДЗІР

Ох, і нялёгкая яна, гэтая камандзірская пасада! Трэба паспець у сотні месц, перагаварыць з дзесяткамі людзей. Трэба, трэба, трэба... Толькі інакш жыць Люда і не змагла б. Бо такая ўдалася ўжо неспакойная, няўрымслівая шукальніца. Калі ў камітэце камсамола філалагічнага факультэта БДУ вырашалі, каму даручыць камандаванне атрадам «Буравеснік-72», спрэчак было шмат. І тут нехта прапанаваў кандыдатуру Люды Агароднік. Іра Рабчынская, сакратар камітэта камсамола, задумалася: можа і сапраўды Люду? Дзяўчына баявая, арганізатарскія здольнасці — выдатныя. Нездарма ж чатыры гады працавала старшай піянерважатай адной са школ у сябе на Украіне. Ды і культмасавы сектар камітэта камсамола, які яна ўзначальвае, працуе нядрэнна. Так у студэнцкага будаўнічага атрада «Буравеснік-72» з'явіўся камандзір.

Як многа было праблем: работа, жыллё, харчаванне. Праблему чысціні вырашылі амаль адразу. Спачатку той-сёй спрабаваў кінуць на тэрыторыі акуркі, пакінуць неприбраным ложак. Тады агульнаатрадны сход вырашыў: за непарадак у пакоях ці на тэрыторыі адказвае кожны асабіста. Цяпер кожную раніцу дзяжурныя здаюць камандзіру пакой з акуратна прыбранымі ложкамі і чыстай падлогай. Шмат прыйшлося змагацца і за адпаведны знешні выгляд байцоў. Нават упартыя «доўгагрывыя» развіталіся са сваёй шавялюрай. А калі вечарам ідуць хлопцы ў клуб, зіхацяць пад форменнымі курткамі беласнежныя сарочкі і прыгожыя гальштукі.

Галоўнае хваляванне Люды — забеспячэнне атрада работай. Па плану ім прадстаіць замацаваць 10 кіламетраў канала і асвоіць 40 тысяч рублёў капіталаўкладанняў. Ужо пройдзены два поўныя кіламетры, хутка будуць скончаны яшчэ паўтара.

Пра меліярацыю яна раней і ведала толькі, што гэта асушэнне балоцістых глеб. А цяпер можа паспрачацца нават са спецыялістамі.

— У такога камандзіра не схаўтурыш,— смяюцца хлопцы.

Быў такі выпадак. Калабоі ўбілі колікі менш чым на 65—70 сантыметраў. Люда праверыла і загадала:

— Перарабіць.

Хлопцы пераглянуліся. Ну каму ахвота рабіць усё спачатку, ды яшчэ ў канцы рабочага дня, калі спіна страшэнна ные і баляць рукі.

— Не хочаце? Тады ідзіце, я сама буду працаваць. І яны падняліся, толькі не дамоў, а каб адабраць у сваёй ваяўнічай камандзіршы калабой і ўсё перарабіць. А Люда стаяла, і хоць яшчэ дрыжэлі ад хвалявання рукі, усміхалася: хіба ж яны падвядуць. Гэта ж яе хлопцы!

Яе хлопцы. Яшчэ паўгода назад, калі толькі быў падабраны састаў атрада, яна сказала:

— Давайце вырашым усё разам. Калі я зраблю што не так, папраўце і дапамажыце. Гаварыце ўсё адкрыта і толькі ў вочы.

Тады пагадзіліся ўсе. Але як толькі прыехалі на месца працы, з'явіліся незадаволеныя строгасцю камандзіра. Тэрміновая нарада камуністаў (іх у атрадзе шэсць чалавек) была бурнай. Сама камуніст, Люда патрабавала ад таварышаў прынцыповасці, строгай паслядоўнасці і дысцыпліны. Не даваць развівацца ляноце і абыякавасці — вось як ставіла пытанне камандзір.

Да дысцыпліны байцы хутка прывыклі і потым у адзін голас сцвярджалі, што Люда лепш за любога хлопца, як кажуць, «свой чалавек».

Хлопцы не сентыментальны народ. Свае пачуцці не любяць выстаўляць напаказ. Але варта толькі крыху засумаваць камандзіру, як нехта пачынае расказваць смешныя здарэнні, другі нясе баян.

Яна стамляецца за дзень страшэнна. То завіхаецца на аб'екце, то наладжвае сувязі з іншымі атрадамі, то едзе ў ПМК-27. Дарэчы, у ПМК-27 іх сустрэлі вельмі цёпла. Дапамаглі наладзіць работу так, каб ніякіх замінак не было, нават далі машыну ў распараджэнне камандзіра.

Пасля вячэры шмат спраў: афармленне штаба, падвядзенне вынікаў дня. Зліпаюцца вочы. А тут хлопцы:

— Люда, хадзем у клуб. Толькі не адмаўляйся, а?

І дзе ж тут адмовішся, калі на цябе глядзяць запра-

(Заканчэнне на 4-й стар.).

# ДРУЖБА КАВАЛАСЯ Ў

Вясёлых, юных, поўных сіл і задору дзяўчат і хлопцаў поезд імчыць у малады беларускі горад Жодзіна. Звычайны састаў, звычайны маршрут. Пройдуць гады, і звычайны маршрут застанецца незвычайным успамінам у памяці тых, хто першым праклаў яго з братняй Балгарыі да нас, на студэнцкую будоўлю. Так, упершыню студэнты-будаўнікі з Сафійскага універсітэта імя Клімента Ахрыдскага сталі гасцямі нашага універсітэта і ўліліся ў інтэрнацыянальны будаўнічы атрад «Дружба».

Перад сустрэчай хваляваліся ўсе: і камандзір атрада М. Нікішын, і камісар Мінскага абласнога штаба СБА, і прадстаўнікі камсамольскай арганізацыі будаўнічага ўпраўлення № 30, прыехаўшыя на вакзал. Валодзя Барысенка, абрываючы пялёсткі рамонкі, паўтарае: «Прыедуць, не прыедуць...». Апошні і... «не прыедуць». Канешне, ніхто на гэта не звярнуў увагі. А Барысенка меў рацыю. У гэты дзень яны не прыехалі. Не было іх і на наступны. І вось радасная вестка даляцела да атрада—«Яны ў Мінску! Затрымаліся ў сталіцы». Значыць, заўтра будуць у Жодзіна.

Стомленыя, вярталіся байцы з работы. Ля сталовай убачылі групу юнакоў і дзяўчат, якія ішлі насустрач. «Яны»,—пачуўся голас Ірыны Бабковай, якая першая пазнала гасцей.

Якой сардэчнай была гэта сустрэча! Яшчэ б, столькі чакалі, столькі хваляваліся. І як жа не радавацца. На першы погляд магло б здацца, што хлопцы і дзяўчаты, якія так цёпла віталі адзін аднаго, знаёмы не першы год.

Але сапраўднае знаёмства, больш цікавае, было яшчэ наперадзе. Прадстаяла сумесная праца ў атрадзе, а менавіта яна закладвае ў студэнтаў пачуццё калектывізму, дружбы, адказнасці за даручаную справу, настойлівасць у рашэнні ўсіх пытанняў. Наперадзе была вялікая будоўля.





ПРАЦОЎНЫ БУДЗЕНЬ

Нам пашчасціла ўдзельнічаць у будаўніцтве новых цэхаў завода, які выпускае самазвалы-гіганты. Праца не з лёгкіх. У дзень па некалькі дзесяткаў кубаметраў бетону брыгада дзяўчат закідвала ў падрыхтаваныя к гэтаму часу другой брыгадай так званыя «башмакі». Вядома, прывыкаць даводзілася вельмі цяжка, асабліва дзяўчатам. Толькі ж учора ўсе выйшлі са студэнцкай аўдыторыі. Да таго ж, не даваў спакою пастаянны праліўны дождж. Міжволі даводзілася прастойваць. Вадзіцелям дождж — не перашкода. Яны падвозяць і падвозяць бетон, які тут жа застыне, калі яго не ўкласці своечасова.

— Трэба неяк дапамагчы дзяўчатам. Не працаваць жа ім у такі дождж,— звяртаецца Райчо Сураў да хлопцаў і тут жа выбягае з-пад навесу.

І так заўсёды. Знайшоўшы свабодную хвіліну, хлопцы спяшаюцца дапамагчы дзяўчатам.

Прайшло некалькі дзён. Надвор'е палепшылася. І тут занепакоіліся нашы дзяўчаты.

— Не хапае бетону. Больш сядзім, чым працуем, —дакладвае камандзіру Рая Міхнавец — брыгадзір.

Аказалася, што машыны не паспяваюць падвозіць бетон для яе брыгады, бадай, лепшай у атрадзе. У Раі немалы вопыт. Вось ужо трэці год яна на студэнцкай будоўлі. Асабліва памятным для яе засталося будаўніцтва аўтазавода ў Тальяці. Сам прараб Павел Красінскі, не такі ўжо і шчодры на пахвалу, заўважыў:

— Адкуль у іх столькі сіл, столькі задору! Учора здаваліся такімі бездапаможнымі, далікатнымі, а вось ужо другі дзень суседнюю брыгаду рабочых абганяюць, нягледзячы на тое, што некаторыя ўпершыню рыдлёўку ў руках трымаюць.

Традыцыяй стала ў атрадзе ўручэнне прыза «Залатая шышка» пры падвядзенні вынікаў работы. Хоць амаль пастаянна яго ўтрымлівалі нашы вядомыя вібратаршчыкі Яўген Парашкеваў і Івап Кехлібараў.

Дарога дадому заўсёды прыемная Чутны звонкі смех, задорная песня. Радасна на душы. Яшчэ адзін дзень прынёс свае плады.

ПАСЛЯ РАБОТЫ

Адпачынак у атрадзе добра прадуман, і культурна-масавая праграма дастаткова насычана. Моцная дружба завязалася з моладдзю БелАЗа і БУ-30, з удзелам якой прайшоў вечар інтэрнацыянальнай дружбы, на якім выступіла агітбрыгада атрада. У зале гучыць «Кацюша». Яе змяняюць «Ела във София», «Падмаскоўныя вечары».

А вечар савецка-балгарскай паэзіі!.. На рускай, беларускай і балгарскай мовах гучалі вершы савецкіх і балгарскіх паэтаў. Вось тут усе і даведаліся, што сярод байцоў атрада ёсць свае пачынаючыя паэты — балгары Якаў Янакіеў і Елісавета Іванава.

А ў выхадныя дні рабяты адпраўляліся ў турысцкія паходы — у лес, на возера. Вечарамі глядзелі кінафільмы і абмяркоўвалі іх, на-

# 9 ВЕРАСНЯ—СВЯТА БАЛГАРСКАГА НАРОДА

*Свята сяброў — і наша свята. Таму па традыцыі кожны год напярэдадні 9 верасня аддзяленне таварыства савецка-балгарскай дружбы БДУ арганізуе кніжныя і фотавыстаўкі, лекцыі, гутаркі, прагляды кінафільмаў, прысвечаныя брацкай Балгарыі. А студэнцкая шматтыражка знаёміць сваіх чытачоў з балгарскімі студэнтамі, якія вучацца ў БДУ, расказвае аб паездках у Балгарыю, аб сяброўстве савецкай і балгарскай моладзі.*

*Са святам, сябры! Поспехаў і працвітання балгарскаму народу!*

## ДЗЕНЬ СВАБОДЫ



## УСЯГО ВАМ ДОБРАГА!

Трынаццаць юнакоў і дзяўчат з Народнай Рэспублікі Балгарыі прыехалі сёлета вучыцца да нас ва універсітэт. Яны будуць займацца на I і II курсах факультэта прыкладной матэматыкі. Наш карэспандэнт сустрэўся з імі і папрасіў расказаць аб сабе, аб уражаннях пасля першых дзён знаходжання ў Мінску.

**Антон ГЕРЧАЎ:**

— Ваш горад зусім падобны на Сафію. Ідучы па вуліцы, забываем нават, што знаходзімся далёка ад радзімы. Мінчане — добрыя і сардэчныя людзі. Жывём мы ў інтэрнаце па вуліцы Кастрычніцкай разам з беларусамі і рускімі. Адразу ж адчулі, што трапілі да сапраўдных сяброў.

**Кунка СПАНЧАВА:**

— Я закончыла I курс матэматычнага факультэта Сафійскага універсітэта. Цяпер, пасля даздачы некаторых прадметаў, буду вучыцца на II курсе ФПМ. Да гэтага вучылася ў горадзе Перніке. Жыла ў родзічаў, таму што мае бацькі працуюць у Русенскай акрузе (бацька — эканаміст, маці — бібліятэкар), дзе гімназіі няма.

У мінулым годзе ў саставе турысцкай групы я прыязджала ў Савецкі Саюз. На жаль, у Мінску мы не былі. Але я многае ведала пра вашу рэспубліку і горад. Чытала пра Хатынь, бачыла многа здымкаў.

Што мне дасць вучоба ў СССР? Па-першае, я атрымаю добрую спецыяльнасць, па-другое, буду мець многа новых добрых сяброў.

**Мікалай БАЖКОЎ:**

— Многіх здзіўляе тое, што ўсе мы добра размаўляем па-руску. Між тым рускую мову ў нас вывучаюць з малодшых класаў. Мы глядзім савецкія фільмы, чытаем кнігі. Нават карыстаемся рускімі падручнікамі па фізіцы і матэматыцы. Цяпер самі зможам убачыць тую краіну, аб якой так многа чулі, пазнаёміцца з яе дзівоснымі людзьмі.

**Красімір КАЛІНАЎ:**

— Біяграфія ў мяне вельмі кароткая: скончыў гімназію, служыў у арміі, дзе ўступіў у рады Балгарскай камуністычнай партыі. У гэтым годзе трымаў конкурсныя экзамены ў Сафійскім універсітэце, каб прыехаць вучыцца ў Савецкі Саюз. Наперадзе — гады вучобы разам з маімі рускімі сябрамі, знаёмства з вашай вялікай краінай.

Хутка мой народ адзначае вялікае свята — Дзень свабоды. Я віншую сваіх сяброў, жадаю ім поспехаў у вучобе і, як гавораць у нас на радзіме, «Всічко най-хубаво!» — усяго добрага!

*НА ЗДЫМКАХ: балгарскія студэнты (на пярэднім плане) на лекцыі па матэматычнай логіцы; Просі Нявена і Мікалай Бажкоў знаёмяцца з выстаўкай, прысвечанай 50-годдзю нашага універсітэта.*

Фота *Д. Чаховіча.*



## ПРАЦЫ

**ладжвалі ігры, танцы ў клубе інтэрната.**

**Асабліва памятны для нашых балгарскіх сяброў выезд у калгас «Парыжская Камуна» Смалявіцкага раёна. Хлебам-соллю сустракалі нас працаўнікі калгаса. А мы дапамаглі ім у будаўніцтве зернясховішча. «Не закончым будаваць—не паедзем», — цвёрда вырашылі студэнты.**

**Два дні прабылі ў гасцях. Бліжэй пазнаёміліся з жыццём калгаса. Правялі спартыўныя спаборніцтвы. Найбольш цікавай была сустрэча па валейболу. А як толькі прагучаў фінальны свісток суддзі, увагу ўсіх прыцягнула сцэна, дзе ўжо выступала агітбрыгада атрада.**

**«Ты жива еще, моя старушка...» — даносіцца са сцэны. Гэта Якаў чытаў вершы свайго любімага паэта Сяргея Ясеніна.**

**Крыху стаміліся, але паездкай засталіся задаволены. Калгаснікі цёпла дзякавалі за дапамогу. Старшыня калгаса ўручыў камандзіру атрада пісьмо-падзяку на імя абласнога штаба СБА.**

**...Аўтобус адлічвае апошнія кіламетры. І вось прыпынак. Адразу спахмурнелі твары. Хатынь. Гэтая невялікая беларуская вёска вядома кожнаму жыхару ў нашай краіне, чулі аб ёй і за мяжой. І вось сюды прыехала група беларускіх і балгарскіх студэнтаў. Яшчэ па дарозе ў Жодзіна нашы сябры з Балгарыі цікавіліся, калі ім давядзецца пабываць у Хатыні. І не дзіўна, бо кожны госць беларускай зямлі лічыць неабходным наведаць мемарыяльны комплекс «Хатынь».**

**Наша група крыху спазнілася. Экскурсавода не было. І тады мы вырашылі ўзяць на сябе абавязкі экскурсаводаў і падрабязна расказаць аб усім, што тут адбылося ў гады вайны. Тым больш, што нашы студэнты ў Хатыні былі не ўпершыню, а сябры з Балгарыі добра ведаюць рускую мову. «Спалена... знішчана... забіта...» — далятаюць да групы словы Люды Барысавай, якая ўзялася за справу экскурсавода. Міжволі набягаюць слёзы...**

**Не заўважылі, як праляцеў тэрмін нашай сумеснай працы ў Жодзіна. Не хацелася пакідаць гэты горад, які стаў для нас блізкім і родным.**

**Адпачынак, можа, не менш цікавы, чакаў нашых сяброў з Балгарыі. Маршрут ужо даўно вядомы: возера Нарач, Ленінград, Масква, Брэст, Кіеў. Госці засталіся задаволены: кожны горад гасцінна сустракаў сяброў. Інтэрнацыянальны касцёр на Нарачы, дзе прысутнічалі студэнты з розных краін свету, Красная плошча ў Маскве, Эрмітаж, Ісакіеўскі сабор, Петрадварэц у Ленінградзе, Брэсцкая крэпасць назаўсёды застануцца ў іх памяці. І як шкада, што хутка праляцела лета і так хутка прыйшло развітанне.**

**М. СВОРАБ,**
**камісар інтэрнацыянальнага атрада**

## СУСТРЭЧА З БАЛГАРЫЯЙ

Вось ужо некалькі год запар студэнты-географы нашага універсітэта падтрымліваюць сяброўскія сувязі з геаграфічным факультэтам Сафійскага універсітэта імя Клімента Ахрыдскага. Абмен дэлегацыямі, сяброўскія сустрэчы дапамагаюць лепш пазнаць адзін аднаго, узбагаціцца новымі ведамі і ўражаннямі.

У гэтым годзе на практыцы ў Народнай Рэспубліцы Балгарыі пабывала група студэнтаў IV курса ў колькасці 10 чалавек.

З Мінска мы выязджалі 14 чэрвеня. Вядома, кожны крыху хваляваўся: наперадзе сустрэча з такой незвычайнай краінай, а галоўнае, сустрэча з новымі сябрамі — працавітым балгарскім народам.

Упершыню мы ўбачылі балгарскую зямлю раніцай з вагона экспрэса Масква—Сафія. Дарога ішла па вузкай даліне імклівай ракі Іскыр, нырала ў частыя тунелі і пакідала ззаду ўсё новыя, падобныя адна на другую спадзістыя вяршыні Старой Пляніны.



Адна з вуліц у Плоўдзіве.
Фота В. МІРОНАВА.

Балгары вельмі гасцінныя, і мы гэта адчувалі з кожным днём усё больш і больш. Нам вельмі пашанцавала. На практыцы мы былі разам са сваімі калегамі з Сафійскага універсітэта. Ехалі ў адным аўтобусе, начавалі ў адных інтэрнатах, адчулі самі жыццё балгарскіх студэнтаў. І ўсюды мы сустракалі ўсмешкі, адчувалі цеплыню і сардэчнасць.

Неяк прафесар Геаргіяў прыязна згадзіўся паехаць з намі на гару Віташу і расказаць аб яе паходжанні. Быў ясны сонечны дзень. Тысячы сафійцаў накіраваліся за горад адпачываць. Мы спыніліся ў канцы доўгай чаргі. Але раптам, даведаўшыся, што апошнімі стаяць савецкія студэнты, людзі расступіліся, даўшы нам магчымасць увайсці першымі ў аўтобус. Нас гэта вельмі кранула. Прыемна адчуваць, з якой любоўю адносяцца ў гэтай краіне да савецкага народа.

А другі цікавы выпадак быў у Радопах, у горадзе Смаляне. Нас размясцілі на начлег у інтэрнаце музычнай школы. І вось калі мы ўсе, стомленыя, ляглі адпачыць, у пакой зайшла 12-гадовая дзяўчынка. Крыху сумеўшыся, яна сказала, што хоча з намі пазнаёміцца, папрасіла нашы адрасы. Дзяўчынка гаварыла аб любві да Савецкага Саюза, да савецкага народа, аб тым, што любоў гэтую ёй прывіваюць бацька і маці.

А пасля дзяўчынка заспявала. Звонкі галасок спяваў народныя радопскія песні. Мы, не хаваючы захаплення і радасці, слухалі гэтую юную спявачку і думалі аб тым, што будучае Балгарыі — гэтыя дзеці.

За час практыкі мы пазнаёміліся амаль з усёй Балгарыяй. Прафесары Сафійскага універсітэта тт. Геаргіяў і Пенкаў стараліся паказаць нам, як вырасла Балгарыя за гады народнай улады. З адсталай аграрнай краіны яна ператварылася ў развітую індустрыяльна-аграрную! Нам паказвалі старажытныя гарады, абавязкова параўноўваючы мінулае з сучаснасцю, пазнаёмілі са старажытнай балгарскай культурай.

Плоўдзіў — другі па велічыні горад Балгарыі. Своеасаблівыя дамы, маляўнічыя вуліцы, мячэці даюць яскравае ўяўленне аб балгарскай архітэктуры часоў турэцкага панавання. Новыя будынкі, прамысловыя прадпрыемствы, ажыўлены рух на асфальтаваных вуліцах, засаджаных дрэвамі, прыгожыя паркі — вось аблічча сучаснага Плоўдзіва. Славутасць яго — гара Вызвалення з манументам савецкага воіна-вызваліцеля. «Алёша» — так ласкава называюць яго балгары.

Далей наша дарога вядзе на Чарнаморскае ўзбярэжжа. Назаўсёды запомнілі мы яркае балгарскае сонца, ласкавае мора і жамчужыны Чарнамор'я — Варну, Несябыр, «Слынчев-Бряг», «Златни-Пясыци».

Хутка праляцеў месяц, і прыйшла пара развітвацца з краінай, якую мы паспелі моцна палюбіць, з новымі добрымі сябрамі, якіх так моцна палюбілі. Сумна, але мы шчаслівыя тым, што маглі лічыць сябе крыху балгарамі, і тым, што цяпер у нас у Балгарыі многа сяброў. Балгарыя назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах. І мы гаворым: «До вижденя, България!». І верым, што спатканне гэтае яшчэ адбудзецца.

**В. АНТАНОВІЧ,**
**студэнтка IV курса**
**геаграфічнага факультэта.**

